Пагавары са мной на роднай мове…

Пагавары са мной на мове,
На нашай роднай, не чужой.
Адчуеш ты – у кожным слове
Душа яднаецца з душой.

З мэтай абуджэння цікавасці да беларускай мовы вучні 5 “А” класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 22 г. Магілёва” 5 кастрычніка 2023 года прынялі ўдзел у інтэлектуальным турніры “Таямніцы роднай мовы”.

Пяцікласнікі шукалі адказы на цікавыя пытанні, прыгадвалі прадметы і называлі іх па-беларуску, разгадвалі загадкі і рэбусы, працавалі перакладчыкамі, тлумачылі сэнс фразеалагізмаў і складалі з імі сказы, падбіралі да іх адпаведнікі з рускай мовы. А ў час правядзення невялікай віктарыны вучні павінны былі спачатку ўспомніць прыказкі, затым – песні, а напрыканцы – вершы і іх аўтараў.

Турнір праходзіў у вельмі цёплай і пяшчотнай абстаноўцы.

У час гэтага мерапрыемства кожны з вучняў у сваім сэрцы пакінуў часцінку сваёй Радзімы, зразумеў, што трэба любіць і шанаваць сваю мову, бо менавіта ў ёй захавана гісторыя нашага народа, моц і прыгажосць роднага слова. Кожны задумаўся аб тым, што засталося нам ад прадзедаў, прыгадаў тое багацце, якім мы, беларусы, павінны валодаць ужо толькі таму, што нарадзіліся і жывём у Беларусі.

Нездарма ж Якуб Колас казаў: “Ніякае багацце людзей не бывае даражэйшым за іх родную мову”.

Настаўнік беларускай мовы і літаратуры Бірукова В.Г.